**ВОДЗЫЎ**
**на аўтарэферат дысертацыі**
**ЯНЫ СЯРГЕЕЎНЫ ШАЎЧЭНКА**
**«Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)»,**
**прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія**

Прадстаўленая праца выканана Янай Сяргееўнай Шаўчэнка на тэму «Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)».

Структура аўтарэферата Я.С. Шаўчэнка адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да сучасных навуковых даследаванняў: змешчаны ўводзіны, у першай главе робіцца аналітычны агляд гістарыяграфіі праблематыцы, пазначаны крыніцы і агульнанавуковыя і спецыяльна-навуковыя метады. У трох главах асноўнай часткі падрабязна апісваецца працэс вырашэння навуковых задач і паказаны высновы і г.д.

Аўтар працы паспяхова выкарыстаў шырокую базу крыніц: матэрыялы аўтарскіх палявых этнаграфічных даследаванняў аўтара на аснове стандартызаванага і нестандартызаванага інтэрв'ю; архіўныя этнаграфічныя матэрыялы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; матэрыялы музейных фондаў; апублікаваныя этнаграфічныя матэрыялы і інш. Я.С. Шаўчэнка выкарыстала міждысцыплінарныя крыніцы.

Матэрыялы даследавання прадстаўлены ў 21 публікацыі аўтара (7 з іх – рэцэнзаваныя навуковыя артыкулы, уключаныя ў Спіс навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў; 13 – публікацыі ў зборніках навуковых артыкулаў, 9 з іх – матэрыялы навуковых канферэнцый; 1 – кніжнае навукова-папулярнае выданне па тэме даследавання).

Праца Я.С. Шаўчэнка «Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)» прадстаўляе асаблівую вартасць для асэнсавання агульнага працэсу інтэнсіўнай мадэрнізацыі беларускага грамадства на працягу XX ст., звязаным з ліквідацыяй непісьменнасці, фарміраваннем сучаснай сістэмы навуковых уяўленняў, масавых камунікацый і пашырэннем электронных тэхналогій, а таксама з трансфармацыяй і інкарпарацыяй кампанентаў традыцыйнай культуры ў масавую ўрбаністычную культуру сучаснай Беларусі. Важным заключэннем даследавання з'яўляецца выснова аб аднаўленні традыцыі выкарыстання раслін у матэрыяльнай культуры беларусаў у пачатку XXI ст., у тым ліку праз Інтэрнэт. Расліны з'яўляюцца складовым кампанентам роднага для этнасу ландшафту, таму раслінныя сімвалы з'яўляюцца аднымі з найчасцей узгадваемых асацыятыўных вобразаў беларусаў, звязаных з роднай зямлёй.

Аўтар працы здолеў сістэмна, усебакова разглядзіць народныя веды беларусаў пра дзікарослыя расліны, выявіў асноўныя кампаненты, паказаў функцыі і даў характарыстыку. Таксама пералічаны сферы выкарыстання, прасочана эвалюцыя народных ведаў, вызначаны рэгіянальныя асаблівасці і перыядызацыя змен у гэтым пласце народнай культуры. Асаблівае значэнне надаецца паказу перспектывы далейшага выкарыстання народных ведаў пра дзікарослыя расліны ў сучаснай культурнай сітуацыі ў Беларусі, што сведчыць аб значнай практычнай вартасці дысертацыі. Дысертацыя непасрэдна звязана і з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) НАН Беларусі.

Вынікі даследавання падаюцца запатрабаваннымі для адукацыйнага працэса, краязнаўства, турыстычнай і музейнай дзейнасці.

Суіскальніку Яне Сяргееўне Шаўчэнка вучоная ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія можа быць прысуджана.

Даю сваю згоду на размяшчэнне свайго водзыву на аўтарэферат кандыдацкай дысертацыі Яны Сяргееўны Шаўчэнка ў глабальнай сетцы Інтэрнэт.

Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі
і паліталогіі,
Беларускага дзяржаўнага
тэхналагічнага ўніверсітэта,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт І.М. Рыжанкоў

Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» Міністэрства Адукацыі Рэспублікі Беларусь

РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

06.12.2023 г.

Подпись Рыжанкова И.М.
Свидетельствую:
Начальник отдела
кадров БГТУ
«06» 12 2023 г.